МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
«МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНА ЎНІВЕРСІТЭТ
імя А. А. КУЛЯШОВА»

Т. А. Казімірская

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Тэставыя заданні

Магілёў
МДУ імя А. А. Куляшова
2018

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Электронны аналаг друкаванага выдання*

**Казімірская, Т. А.** Методыка выкладання беларускай мовы. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2018. – 52 с.

ISBN 978-985-568-481-8

Зборнік тэставых заданняў па дысцыпліне "Методыка выкладання беларускай мовы" прадназначаны студэнтам філалагічных спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі. Выданне ўключае тэсты па асноўных тэмах методыкі выкладання беларускай мовы, ("Мэты, змест і структура моўнай адукацыі", "Прадмет, задачы, фундаментальныя паняцці і навуковыя асновы методыкі выкладання беларускай мовы", "Прынцыпы навучання", "Метады і прыёмы навучання беларускай мове" і інш.). Да ўсіх заданняў дадзены адказы. У дадатку размешчаны нарматыўныя дакументы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць адукацыйны працэс сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

Рэкамендуецца выкладчыкам методыкі беларускай мовы, настаўнікам сярэдніх агульнаадукацыйных школ, студэнтам філалагічных спецыяльнасцей.

**УДК 378.016:81.411.3(076)**
**ББК 74.268.19 = 411.3в6**

**Казімірская, Т. А.** Методыка выкладання беларускай мовы [Электронны рэсурс] : тэставыя заданні. – Электрон. дадзеныя. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2017. – Загал. з экрана.

212022, г. Магілёў,
вул. Касманаўтаў, 1
Тэл.: 8-0222-28-31-51
E-mail: alexpzn@mail.ru
http://www.msu.by

© Казімірская Т.А., 2018
© МДУ імя А.А. Куляшова, 2018
© МДУ імя А. А. Куляшова, электронны аналаг, 2018

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРАДМОВА

Прафесійна-метадычная падрыхтоўка студэнтаў-філолагаў ва ўніверсітэце складаецца з засваення імі тэорыі навучання школьнікаў беларускай мове і з авалодання ўменнямі навучыць дзяцей карыстацца беларускай мовай у розных сферах яе прымянення. Тэарэтычную падрыхтоўку студэнты атрымліваюць на лекцыях, факультатывах, спецкурсах, замацоўваюць яе пры напісанні курсавых работ. Асноўнай формай навучання з'яўляецца лекцыйны курс, які фарміруе ў студэнтаў метадычнае мысленне – аперыраванне метадычнымі паняццямі, разуменне рэальнай вучэбнай сітуацыі і прымяненне метадычных ведаў у розных, нярэдка зменлівых умовах. Практычная падрыхтоўка студэнтаў рэалізуецца на практычных занятках, а таксама ў час педагагічнай практыкі.

Тэарэтыка-метадычная падрыхтоўка будучых настаўнікаў заклікана вырашаць наступныя задачы: 1) узброіць студэнтаў фундаментальнымі навукова-метадычнымі ведамі аб працэсе навучання беларускай мове і выхаванні дзяцей сродкамі свайго прадмета; 2) навучыць свядома ствараць свій уласны вопыт выкладання беларускай мовы; 3) сфарміраваць у будучых настаўнікаў уменне адрозніваць сапраўды карыснае з вопыту іншых настаўнікаў.

У прапанаваным дапаможніку разглядаюцца ў сістэматызаваным выглядзе тэорыя методыкі выкладання беларускай мовы з улікам апошніх яе дасягненняў.

Змест тэстаў адпавядае Праграме па методыцы выкладання беларускай мовы для філалагічных спецыяльнасцей установ адукацыі, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі.

Кожны тэматычны тэст складаецца з заданняў закрытага тыпу, для якіх прапануецца 4(5) варыянтаў адказаў. Выбраць і адзначыць трэба правільны (правільныя).

Выданне прызначана для студэнтаў філалагічнага факультэта і павінна дапамагчы будучаму настаўніку сярэдняга звяна агульнаадукацыйнай школы ў працы на ўроках беларускай мовы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# 1. МЭТЫ, ЗМЕСТ І СТРУКТУРА МОЎНАЙ АДУКАЦЫІ

**1. Адзначце найважнейшыя функцыі мовы**
1) быць сродкам зносін
2) быць сродкам разумення прыроды
3) быць сродкам мастацкіх твораў
4) быць сродкам пазнання свету
5) быць сродкам разумення грамадства
**2. З якіх узроўняў складаецца структура моўнай асобы?**
1) вербальна-семантычны
2) адукацыйны
3) матывацыйны
4) тэзаурусны
5) выхаваўчы
**3. Адзначце стратэгічныя мэты моўнай адукацыі**
1) развіццё творчай асобы вучня
2) развіццё моўнай асобы вучня
3) авалоданне школьнікамі трывалымі арфаграфічнымі навыкамі
4) авалоданне школьнікамі трывалымі графічнымі навыкамі
5) выхаванне нацыянальнай самасвядомасці
**4. Адзначце стратэгічныя мэты моўнай адукацыі**
1) фарміраванне моўнай асобы вучня
2) быць сродкам перадачы ведаў
3) авалоденне навыкамі выразнага чытааня
4) авалоданне школьнікамі трывалымі пунктуацыйнымі навыкамі
5) авалоданне школьнікамі арфаэпічнымі нормаміі
**5. Адбор сучаснага зместу курса беларускай мовы ў сярэдняй школе ажыццяўляецца з улікам крытэрыяў:**
1) пераемнасці
2) сістэмнасці
3) функцыянальнасці
4) навуковасці
5) перспектыўнасці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**6. Адбор сучаснага зместу курса беларускай мовы ў сярэдняй школе ажыццяўляецца з улікам крытэрыяў:**

1) камунікатыўнасці
2) нарматыўнасці
3) трываласці
4) лагічнасці
5) практычнасці

**7. Змест школьнага курса беларускай мовы ўключае раздзелы**

1) стылістыка
2) лексіка
3) дыялекталогія
4) фанетыка і арфаэпія
5) марфалогія і арфаграфія

**8. Змест навучання беларускай мове раскрываецца ў**

1) слоўніку
2) школьнай праграме
3) даведніку
4) падручніку
5) адукацыйным стандарце

**9. Адзначце структурныя элементы школьнай праграмы па беларускай мове**

1) змест
2) уласна праграма
3) заключэнне
4) тлумачальная запіска
5) уступ

**10. Адзначце структурныя элементы уласна праграмы па беларускай мове**

1) змест школьнага курса беларускай мовы
2) пералік уменняў школьнікаў
3) дыдактычны матэрыял
4) спіс літаратуры
5) тэмы сачыненняў

**11. Адзначце мэты вывучэння прадмета “Беларуская мова”**

1) сфарміраваць у вучняў сістэму ведаў пра мову і маўленне
2) навучыць карыстацца беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці
3) развіваць інтэлектуальную, камунікатыўную, духоўна-маральную і грамадзянскую культуру вучняў
4) развіваць матэматычныя здольнасці вучняў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## 2. ПРАДМЕТ, ЗАДАЧЫ, ФУНДАМЕНТАЛЬНЫЯ ПАНЯЦЦІ І НАВУКОВЫЯ АСНОВЫ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**1. Мэтамі вучэбнай методыкі з'яўляюцца:**
1) распрацоўка эфектыўнай тэхналогіі навучання
2) фарміраванне сродкамі прадмета асобы вучня
3) авалоданне пэўнымі ведамі
4) фізічнае выхаванне
5) усебаковае развіццё асобы

**2. Прадметам методыкі беларускай мовы з'яўляецца:**
1) працэс навучання мове
2) даследаванне заканамернасцей засваення мовы
3) беларуская мова
4) распрацоўка тэхналогіі навучання
5) эстэтычнае выхаванне

**3. Асноўнымі задачамі методыкі мовы з'яўляюцца:**
1) вывучэнне стылістыкі
2) вызначэнне мэт навучання беларускай мове
3) вызначэнне задач навучання беларускай мове
4) вызначэнне зместу навучання беларускай мове
5) вывучэнне арфаэпіі

**4. Асноўнымі задачамі методыкі мовы з'яўляюцца:**
1) вывучэнне заканамернасцей засваення мовы
2) вывучэнне гісторыі літаратуры
3) вывучэнне метадычнай спадчыны
4) пошук эфектыўных метадаў навучання
5) вывучэнне біяграфіі пісьменнікаў

**5. Фундаментальнымі паняццямі методыкі навучання мове з'яўляюцца:**
1) арфаграфія
2) мэты і змест моўнай адукацыі
3) прынцыпы навучання
4) метады і прыёмы навучання
5) адукацыйныя тэхналогіі

**6. Пад зместам моўнай адукацыі разумеюць:**
1) этычнае выхаванне
2) эканамічнае развіццё
3) лінгвістычныя звесткі
4) маўленчыя навыкі
5) спосабы дзейнасці пазнання мовы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**7. Спосаб узаемадзеяння настаўніка і вучня, накіраваны на дасягненне пэўнай дыдактычнай мэты – гэта …**

**8. Тэарэтычнымі асновамі методыкі мовы з’яўляюцца:**

1) філасофія
2) логіка
3) лінгвістыка
4) псіхалогія
5) гісторыя

**9. Методыка мовы грунтуецца на наступных зыходных палажэннях філасофіі:**

1) мова – найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі
2) філасофія – аснова ўсіх навук
3) мова выконвае сацыяльную функцыю
4) маўленне звязана з мысленнем
5) гісторыя звязана з геаграфіяй

**10. Метад пазнання ад агульнага вываду да канкрэтных фактаў – гэта…**

**11. Метад пазнання ад канкрэтных фактаў да агульнага вываду – гэта…**

**12. Змест школьнага курса беларускай мовы вызначае перш за ўсё:**

1) філасофія
2) логіка
3) лінгвістыка
4) псіхалогія
5) гісторыя

**13. Адзначце агульнадыдактычныя прынцыпы навучання:**

1) прынцып навуковасці
2) прынцып заканамернасці
3) прынцып даступнасці
4) прынцып сістэмнасці
5) прынцып нагляднасці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**14. Працэс засваення ведаў уключае ў сябе:**
1) успрыманне
2) разуменне
3) усведамленне
4) намаганне
5) фарміраванне

**15. Працэс засваення ведаў уключае ў сябе:**
1) успрыманне
2) параўнанне
3) выкананне
4) замацаванне
5) прымяненне

## 3. ПРЫНЦЫПЫ НАВУЧАННЯ

**1. Адзначце агульнадыдактычныя прынцыпы ў навучанні беларускай мове**
1) прынцып навуковасці
2) прынцып разумення моўных значэнняў
3) прынцып сістэматычнасці
4) прынцып даступнасці

**2. Адзначце агульнадыдактычныя прынцыпы ў навучанні беларускай мове**
1) прынцып ацэнкі выразнасці мовы
2) прынцып нагляднасці
3) прынцып пераемнасці
4) прынцып адчування мовы

**3. Адзначце прыватнаметадычныя прынцыпы ў навучанні беларускай мове**
1) прынцып каардынацыі вуснай і пісьмовай мовы
2) прынцып функцыянальнай накіраванасці
3) прынцып перспектыўнасці
4) сувязі тэорыі з практыкай

**4. Які агульнадыдактычны прынцып ў навучанні беларускай мове абазначае, што змест навучання беларускай мове павінен адпавядаць сучаснаму стану развіцця лінгвістычнай навукі**
1) прынцып навуковасці
2) прынцып сістэматычнасці
3) прынцып паслядоўнасці
4) прынцып свядомасці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**5. Які агульнадыдактычны прынцып ў навучанні беларускай мове абазначае, што лінгвістычны матэрыял павінен вывучацца ў пэўнай сістэме?**

1) прынцып навуковасці
2) прынцып сістэматычнасці
3) прынцып паслядоўнасці
4) прынцып свядомасці

**6. Які агульнадыдактычны прынцып ў навучанні беларускай мове заключаецца ў асэнсаваным засваенні моўных з'яў, правіл, законаў?**

1) прынцып навуковасці
2) прынцып сістэматычнасці
3) прынцып паслядоўнасці
4) прынцып свядомасці

**7. Які агульнадыдактычны прынцып ў навучанні беларускай мове патрабуе выкарыстання наглядных дапаможнікаў?**

1) прынцып нагляднасці
2) прынцып сістэматычнасці
3) прынцып паслядоўнасці
4) прынцып свядомасці

**8. Які агульнадыдактычны прынцып ў навучанні беларускай мове заключаецца ў апоры на раней вывучанае?**

1) прынцып нагляднасці
2) прынцып сістэматычнасці
3) прынцып паслядоўнасці
4) прынцып пераемнасці і перспектыўнасці

**9. Які агульнадыдактычны прынцып ў навучанні беларускай мове прадугледжвае авалоданне вучнямі як тэарэтычнымі ведамі, так і практычнымі навыкамі?**

1) прынцып нагляднасці
2) прынцып сістэматычнасці
3) прынцып сувязі тэорыі з практыкай
4) прынцып свядомасці

**10. Які прыватнаметадычны прынцып ў навучанні беларускай мове патрабуе комплекснага вывучэння розных бакоў мовы?**

1) прынцып разумення моўных значэнняў
2) прынцып адчування мовы
3) прынцып ацэнкі выразнасці мовы
4) функцыянальнай накіраванасці навучання мове

**11. Які прыватнаметадычны прынцып ў навучанні беларускай мове патрабуе забяспечыць у навучальным працэсе апераджальнае развіццё вуснай мовы ў параўнанні з пісьмовай?**



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1) прынцып разумення моўных значэнняў
2) прынцып адчування мовы
3) прынцып ацэнкі выразнасці мовы
4) каардынацыі вуснай і пісьмовай мовы

**12. Які прыватнаметадычны прынцып ў навучанні беларускай мове патрабуе арганізацыі на ўроку актыўнай маўленчай дзейнасці?**
1) прынцып разумення моўных значэнняў
2) прынцып адчування мовы
3) прынцып ацэнкі выразнасці мовы
4) камунікатыўнай накіраванасці навучання мове

**13. Які прыватнаметадычны прынцып ў навучанні беларускай мове патрабуе падбору тэкстаў культурнага, прыродазнаўчага, гістарычнага характару?**
1) прынцып апоры на этнакультуру
2) прынцып адчування мовы
3) прынцып ацэнкі выразнасці мовы
4) функцыянальнай накіраванасці навучання мове

## 4. МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**1. Метады навучання падзяляюцца**
1) паводле крыніцы перадачы вучэбнай інфармацыі
2) па логіцы перадачы інфармацыі
3) па логіцы
4) па ступені самастойнасці вучняў

**2. Паводле крыніцы перадачы і ўспрымання вучэбнай інфармацыі метады навучання беларускай мове падраздзяляюцца на:**
1) славесныя
2) наглядныя
3) практычныя
4) індуктыўныя

**3. Да славесных метадаў навучання мове адносяцца**
1) ілюстрацыі
2) назіранні
3) паведамленне
4) гутарка

**4. Да наглядных метадаў навучання мове адносяцца**
1) ілюстрацыі
2) назіранні
3) паведамленне
4) гутарка



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**5. Да практычных метадаў навучання мове адносяцца**

1) ілюстрацыі
2) назіранні
3) практыкаванні
4) гутарка

**6. Па логіцы перадачы і ўспрымання інфармацыі метады навучання мове падзяляюцца на:**

1) індуктыўныя
2) практычныя
3) дэдуктыўныя
4) лінгвістычныя

**7. Па ступені самастойнасці мыслення вучняў пры авалоданні ведамі адрозніваюць метады навучання мове**

1) рэпрадуктыўныя
2) практычныя
3) дэдуктыўныя
4) праблемна-пошукавыя

**8. Адзначце метады кантролю за вучэбнай дзейнасцю вучняў**

1) метады лагічнага кантролю
2) метады вуснага кантролю
3) метады лінгвістычнага кантролю
4) метады пісьмовага кантролю

**9. Адзначце метады вуснага кантролю за вучэбнай дзейнасцю вучняў**

1) франтальнае апытванне
2) дыктант
3) вусны залік
4) пераказ

**10. Адзначце метады пісьмовага кантролю за вучэбнай дзейнасцю вучняў**

1) франтальнае апытванне
2) дыктант
3) сачыненне
4) пераказ

**11. Адзначце віды гутаркі**

1) падрыхтоўчая
2) узнаўляльная
3) эўрыстычная
4) арганізацыйная

**12. Адзначце віды практыкаванняў**

1) праблемныя
2) аналітычныя
3) аналітыка-сінтэтычныя
4) сінтэтычныя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# 5. УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**1. Асноўнай формай навучання і выхавання дзяцей у школе лічыцца**
1) факультатыў
2) урок
3) гурток
4) залік

**2. Тып урока залежыць ад**
1) мэты ўрока
2) тыпу ўрока
3) выхаваўчай задачы ўрока
4) відаў працы на ўроку

**3. Адзначце структурныя кампаненты ўрока**
1) арганізацыйны момант
2) слова настаўніка
3) пастаноўка мэты ўрока
4) праверка дамашняга задання

**4. Адзначце структурныя кампаненты ўрока**
1) развіццё маўлення
2) замацаванне вывучанага
3) тлумачэнне новага матэрыялу
4) пісьмовы залік

**5. Адзначце структурныя кампаненты ўрока**
1) абагульненне
2) гутарка
3) падвядзенне вынікаў
4) праца з падручнікам

**6. Этап урока, які арганізуе вучняў на ўспрыманне матэрыялу, называюць**
1) арганізацыйны момант
2) пастаноўка мэты ўрока
3) праверка дамашняга задання
4) тлумачэнне новага матэрыялу

**7. Этап урока, які дае магчымасць выявіць узровень ведаў і падрыхтаванасці вучняў да ўрока, называюць**
1) арганізацыйны момант
2) пастаноўка мэты ўрока
3) праверка дамашняга задання
4) тлумачэнне новага матэрыялу

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**8. Найбольш складаны і адказны этап урока, у час якога вучні вучацца думаць, рабіць высновы**

1) арганізацыйны момант
2) пастаноўка мэты ўрока
3) праверка дамашняга задання
4) тлумачэнне новага матэрыялу

**9. Этап урока, які праводзяць непасрэдна пасля тлумачэння новага матэрыялу, называюць**

1) замацаванне ведаў
2) пастаноўка мэты ўрока
3) праверка дамашняга задання
4) тлумачэнне новага матэрыялу

**10. Тыпы урокаў вызначаюцца ў залежнасці ад**

1) дыдактычных мэт
2) асноўных этапаў урока
3) зместу выхавання
4) спосабаў арганізацыі навучання

**11. У залежнасці ад дыдактычнай мэты ў методыцы навучання мове традыцыйна вылучаюць наступныя тыпы ўрокаў**

1) урок вывучэння новага матэрыялу
2) урок замацавання ведаў
3) урок знаёмства
4) камбінаваны ўрок

**12. У залежнасці ад дыдактычнай мэты ў методыцы навучання мове традыцыйна вылучаюць наступныя тыпы ўрокаў**

1) урок развіцця звязнага маўлення
2) урок аналізу пісьмовых прац
3) урок кантролю і ацэнкі ведаў
4) арганізацыйны ўрок

# 6. МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ АРФАГРАФІІ

**1. Адзначце этапы засваення арфаграфіі:**

1) асноўны (5–7 класы)
2) выніковы
3) падрыхтоўчы
4) пачатковы (1–4 класы)
5) сістэматызацыя і падагульненне навыкаў

**2. Адзначце задачы навучання арфаграфіі:**

1) сфарміраваць арфаграфічныя ўменні



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2) выхоўваць арфаграфічную пільнасць
3) удасканальваць навыкі вымаўлення
4) пазнаёміць з арфаграфічнымі паняццямі
5) развіваць маўленне

**3. Адзначце прынцыпы вывучэння арфаграфіі:**

1) прынцып адваротнай сувязі
2) прынцып сувязі арфаграфіі з развіццём маўлення
3) прынцып уліку структуры дзейнасці
4) прынцып узаемасувязі розных узроўняў мовы
5) фанетычны прынцып

**4. Адзначце элементы працы па выпрацоўцы арфаграфічных навыкаў:**

1) вымаўленне слова
2) тлумачэнне значэння слова
3) падрыхтоўка да ўспрымання правіла
4) тлумачэнне правіла
5) выкананне практыкаванняў

**5. Адзначце метады навучання арфаграфіі:**

1) аналіз
2) супастаўленне
3) вызначэння
4) сінтэз
5) супрацьпастаўлення

**6. Адзначце групы арфаграм:**

1) арфаэпічныя
2) фанетычныя
3) марфолага-сінтаксічныя
4) сінтаксічныя
5) марфалагічныя

**7. Адзначце віды дыктантаў па мэце правядзення:**

1) кантрольны
2) навучальны
3) тлумачальны
4) праверачны
5) папераджальны

**8. Адзначце віды дыктантаў па часе тлумачэння арфаграм:**

1) тлумачальны
2) навучальны
3) папераджальны
4) праверачны
5) каменціраваны



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**9. Устанавіце адпаведнасць дыктантаў па часе тлумачэння арфаграм:**

| | |
|---|---|
| А. папераджальны | 1) спачатку запіс, потым тлумачэнне |
| Б. тлумачальны | 2) спачатку тлумачэнне, потым запіс |
| В. каменціраваны | 3) каментарый у працэсе пісьма |

**10. Устанавіце паслядоўнасць схемы кантрольнага дыктанта:**

1) праслухоўванне сказа, запамінанне яго, чытанне па частках настаўнікам, запіс вучнямі.

2) выразнае чытанне настаўнікам усяго тэксту дыктанта.

3) чытанне настаўнікам сказа , праверка яго вучнямі.

4) тлумачэнне незразумелых слоў

5) паўторнае чытанне настаўнікам тэксту дыктанта.

А.– Б. – В. – Г. – Д. –

## 7. МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ПУНКТУАЦЫІ

**1. Раздел методыкі мовы, у якім асэнсоўваецца працэс фарміравання ў вучняў пунктуацыйных уменняў і навыкаў, называецца**

1) методыка  навучання марфалогіі

2) методыка навучання фанетыкі

3) методыка навучання арфаграфіі

4) методыка навучання пунктуацыі

**2. Да пазнавальных мэт вывучэння пунктуацыі адносяцца**

1) знаёмства з арфаграфічнымі паняццямі

2) асэнсаванне пунктуацыі як сістэмы

3) разуменне прызначэння знакаў прыпынку

4) азнаямленне з функцыямі знакаў прыпынку

**3. Да практычных мэт вывучэння пунктуацыі адносяцца**

1) разуменне прызначэння знакаў прыпынку

2) азнаямленне з функцыямі знакаў прыпынку

3) развіваць у вучняў пунктуацыйную пільнасць

4) знаходзіць арфаграмы ў тэксце

**4. Адзначце спецыфічныя прынцыпы методыкі навучання пунктуацыі**

1) фанетычны прынцып

2) семантыка-граматычны прынцып

3) прынцып паслядоўнага і асэнсаванага фарміравання навыкаў пастаноўкі знакаў прыпынку

4) арфаэпічны прынцып



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**5. Праца па засваенні пунктуацыйнага правіла павінна ўключаць наступныя этапы**

1) асэнсаванне правіла

2) запамінанне правіла

3) выпрацоўка навыку прымянення правіла

4) каліграфія пісьма

**6. У аснове якога прынцыпу методыкі навучання пунктуацыі ляжыць аналіз сэнсу выказвання, яго інтанацыйнага афармлення і граматычнай структуры сказа**

1) фанетычны прынцып

2) семантыка-граматычны прынцып

3) прынцып паслядоўнага і асэнсаванага фарміравання навыкаў пастаноўкі знакаў прыпынку

4) арфаэпічны прынцып

**7. Асэнсаванне пунктуацыі і яе ролі пачынаецца ў працы**

1) над словам

2) над спалучэннем слоў

3) над словазлучэннем

4) над звязным тэкстам

**8. Метады і прыёмы працы па пунктуацыі ахопліваюць**

1) сэнсавы аналіз сказа

2) структурны аналіз сказа

3) фанетычны аналіз слова

4) інтанацыйны аналіз сказа

**9. Метады і прыёмы працы па пунктуацыі ахопліваюць**

1) праслухоўванне

2) дыктанты

3) складанне сказаў

4) пунктуацыйны разбор

**10. Метады і прыёмы працы па пунктуацыі ахопліваюць**

1) складанне сказаў па схеме

2) розныя віды спісвання

3) складанне схемы сказа

4) аналіз пачутага

## 8. МЕТОДЫКА ЛЕКСІКІ І ФРАЗЕАЛОГІІ

**1. Пазнавальныя мэты працы па лексіцы і фразеалогіі маюць на ўвазе знаёмства:**

1) з лексічнай сістэмай роднай мовы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2) з сістэмай лексічных паняццяў
3) з марфемнай структурай слова
4) з фанетычным ладам мовы

**2. Пазнавальныя мэты працы па лексіцы і фразеалогіі маюць на ўвазе знаёмства з лексічнымі паняццямі**

1) лексічнае значэнне слова
2) прамое і пераноснае значэнне
3) адназначныя і мнагазначныя словы
4) спосабы выражэння дзейніка

**3. Пазнавальныя мэты працы па лексіцы і фразеалогіі маюць на ўвазе знаёмства з лексічнымі паняццямі**

1) сінонімы
2) прыметнік
3) назоўнік
4) антонімы

**4. Пазнавальныя мэты працы па лексіцы і фразеалогіі маюць на ўвазе знаёмства з лексічнымі паняццямі**

1) дзеяслоў
2) просты сказ
3) амонімы
4) прафесійныя словы

**5. Пазнавальныя мэты працы па лексіцы і фразеалогіі маюць на ўвазе знаёмства з лексічнымі паняццямі**

1) прыстаўка
2) фразеалагізмы
3) дыялектныя словы
4) аднародныя члены сказа

**6. Пры фарміраванні лексічных і фразеалагічных уменняў і навыкаў вучні павінны ўмець**

1) акрэсліваць значэнне вядомых ім слоў
2) адрозніваць лексічнае значэнне слова ад граматычнага
3) правільна вымаўляць словы
4) рабіць марфемны аналіз слоў

**7. Пры фарміраванні лексічных і фразеалагічных уменняў і навыкаў вучні павінны ўмець**

1) правільна і прыгожа пісаць
2) вызначаць семантыку слова і фразеалагізма ў кантэксце
3) выконваць марфалагічны аналіз часцін мовы
4) знаходзіць у тэксце лексічныя і фразеалагічныя адзінкі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**8. Пры фарміраванні лексічных і фразеалагічных уменняў і навыкаў вучні павінны ўмець**

1) адрозніваць вывучаныя лексічныя з’явы і фразеалагізмы
2) выконваць словаўтваральны аналіз
3) карыстацца рознымі тыпамі слоўнікаў, даведнікаў
4) выконваць сінтаксічны разбор сказа

**9. Да спецыфічных прынцыпаў вывучэння лексікі і фразеалогіі адносяцца**

1) развіццё фанематычнага слыху вучня
2) узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу вучня
3) экстралінгвістычны прынцып
4) прынцып фразавага скланення

**10. Да спецыфічных прынцыпаў вывучэння лексікі і фразеалогіі адносяцца**

1) лексіка-граматычны прынцып
2) функцыянальны прынцып
3) прынцып назірання над мовай
4) прынцып адзінства формы і зместу

**11. Адзначце формы актывізацыі слоўніка вучня**

1) падбор сінонімаў
2) складанне сказаў
3) удакладненне значэння слоў і фразеалагізмаў
4) развіццё арфаграфічнай пільнасці

**12. Адзначце формы актывізацыі слоўніка вучня**

1) падбор антонімаў, сінонімаў
2) падбор аднакарэнных слоў
3) этымалагічныя звесткі пра паходжанне слоў, фразеалагізмаў
4) сінтаксічны разбор

**13. Прынцып вывучэння лексікі і фразеалогіі, які мае на ўвазе супастаўленне слова з рэаліяй, называецца**

1) эксралінгвістычны
2) лексіка-граматычны
3) функцыянальны
4) арфаграфічны

**14. Прынцып вывучэння лексікі і фразеалогіі, які мае на ўвазе пастаянны зварот да лексічнага і граматычнага значэння слова, называецца**

1) эксралінгвістычны
2) лексіка-граматычны
3) функцыянальны
4) арфаграфічны



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**15. Прынцып вывучэння лексікі і фразеалогіі, які патрабуе разглядаць семантыку слоў і фразеалагізмаў, улічваючы стылістычную прыналежнасць, называецца**

1) эксралінгвістычны
2) лексіка-граматычны
3) функцыянальны
4) арфаграфічны

**16. Прынцып вывучэння лексікі іфразеалогіі, які прадугледжвае выкарыстанне даступных звестак пра паходжанне слова, змяненне яго значэння, называецца**

1) эксралінгвістычны
2) лексіка-граматычны
3) функцыянальны
4) гістарычны

**17. Паводле дыдактычных задач лексічныя практыкаванні падзяляюцца на**

1) уласна лексічныя
2) граматычныя
3) камбінаваныя
4) фанетычныя

**18. Сярод уласна лексічных практыкаванняў вылучаюць наступныя віды**

1) лексіка-семантычныя
2) логіка-лексічныя
3) арфаэпічныя
4) марфалагічныя

**19. Лексічныя практыкаванні, скіраваныя на разуменне сутнасці лексічных адзінак у тэксце, на выяўленне іх прымет, назыюцца**

1) лексіка-семантычныя
2) логіка-лексічныя
3) арфаэпічныя
4) марфалагічныя

**20. Лексічныя практыкаванні, якія дапамагаюць засвоіць асноўныя лагічныя прыёмы супастаўлення, параўнання, класіфікацыі, назыюцца**

1) лексіка-семантычныя
2) логіка-лексічныя
3) арфаэпічныя
4) марфалагічныя

**21. Лексічныя практыкаванні, заснаваныя на прынцыпах узаемасувязі ўсіх раздзелаў школьнага курса мовы, назыюцца**

1) лексіка-семантычныя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2) логіка-лексічныя
3) камбінаваныя
4) марфалагічныя

**22. Адбіраючы фразеалагізмы для працы на ўроках беларускай мовы,трэба ўлічваць наступныя ўласцівасці адзінак**

1) нарматыўнасць, адпаведнасць сучаснай літаратурнай мове
2) актыўнасць ужывання ў школьных падручніках
3) актыўнасць ужывання ў вусным маўленні
4) структуру сказа

**23. Адбіраючы фразеалагізмы для працы на ўроках беларускай мовы,трэба ўлічваць наступныя ўласцівасці адзінак**

1) ілюстраванне нацыянальнай спецыфікі беларускай мовы
2) актыўнасць ужывання ў творах мастацкай літаратуры
3) структуру сказа
4) актыўнасць ужывання ў вусным маўленні

**24. Сярод прыёмаў навучання фразеалогіі вылучаюць наступныя**

1) прыём семантызацыі
2) прыём паўтарэння
3) напісанне сачынення-мініяцюры на аснове фразеалагізма (прыказкі)
4) пераказ з выкарычтанне устоўлівых выразаў

**25. Сярод прыёмаў навучання фразеалогіі вылучаюць наступныя**

1) прыём падкрэсленага вымаўлення
2) этымалагічны аналіз фразеалагізма
3) падбор ілюстрацый для фразеалагізмаў
4) праца з фразеалагічнымі даведнікамі

## 9. МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ФАНЕТЫКІ

**1. Адзначце задачы вывучэння фанетыкі і графікі**

1) прывесці ўсістэму веды вучняў пра гукавы лад і графіку беларускай мовы
2) выпрацаваць уменне слухаць і аналізаваць вуснае маўленне
3) развіваць маўленне вучняў
4) развіваць арфаграфічную пільнасць вучняў

**2. Адзначце задачы вывучэння фанетыкі і графікі**

1) пазнаёміць з лексічнай сістэмай роднай мовы
2) пазнаёміць з марфемнай структурай слова
3) выпрацоўваць прыёмы фанетычнага і арфаэпічнага разбору слова
4) ствараць аснову для засваення беларускай арфаграфіі і граматыкі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**3. Адзначце задачы вывучэння фанетыкі і графікі**

1) развіваць моўны слых вучняў

2) дапамагаць авалодаць правіламі напісання

3) дапамагаць авалодаць сродкамі выразнасці вуснага маўлення

4) вучыць адчуваць прыгажосць у гучанні беларускага слова

**4. Урокі па фанетыцы павінны сфарміраваць у вучняў наступныя ўменні**

1) расстаўляць знакі прыпынку

2) правільна вымаўляць у словах гукі

3) правільна пісаць словы

4) чуць кожны гук у слове і аддзяляць яго ад суседняга гука

**5. Урокі па фанетыцы павінны сфарміраваць у вучняў наступныя ўменні**

1) называць гукі ў слове па парадку і вызначаць іх колькасць

2) выконваць марфалагічны разбор часцін мовы

3) Даваць якасную характарыстыку кожнаму гуку

4) складаць сказы

**6. Адзначце метады і прыёмы працы на ўроках фанетыкі**

1) марфалагічны разбор

2) фанетычны разбор

3) аналіз пачутага выказвання па прапанаваным плане

4) словаўтваральны аналіз

**7. План аналізу пачутага выказвання можа ўключаць такія элементы, як**

1) аналіз пастаноўкі голасу

2) аналіз дыкцыі

3) аналіз пісьмовых прац

4) аналіз убачанага

**8. План аналізу пачутага выказвання можа ўключаць такія элементы, як**

1) аналіз пачуццяў

2) аналіз прачытанага

3) аналіз інтанацыі

4) аналіз размеранасці маўлення

## 10. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ СЛОВАЎТВАРЭННЯ

**1. Адзначце мэты вывучэння раздзела “Словаўтварэнне”**

1) навучыць размяжоўваць формы аднаго слова і розныя словы аднаго кораня



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2) даць паняцце пра канчатак, корань суфікс і прыстаўку
3) даць паняцце пра гукі мовы
4) выпрацаваць навыкі марфалагічнага разбору

**2. Адзначце мэты вывучэння раздзела “Словаўтварэнне”**
1) выпрацаваць навыкі марфемнага і словаўтваральнага аналізу
2) выпрацаваць навыкі фанетычнага аналізу
3) замацаваць навыкі правапісу каранёў, прыставак, суфіксаў
4) паказаць стылістычныя магчымасці словаўтварэння

**3. Адзначце спецыфічныя прынцыпы выкладання словаўтварэння**
1) прынцып навуковасці
2) размяжоўваць сінхронны і дыяхранічны прынцыпы аналізу слова
3) супастаўленне аналізу і сінтэзу
4) прынцып даступнасці

**4. Адзначце метады і прыёмы працы на ўроках па словаўтварэнні**
1) звяртаць увагу на семантыку слоў
2) высвятляць значэнне кожнай марфемы
3) звяртаць увагу на правапіс слоў
4) вызначаць колькасць гукаў у слове

**5. Адзначце практыкаванні на замацаванне ведаў пра паняцці марфемікі і словаўтварэння**
1) выпісаць з тэксту вытворныя словы
2) вызначыць функцыю адзінак марфемікі і словаўтварэння
3) растлумачыць значэнне каранёў, прыставак, суфіксаў у слове
4) вызначыць сінтаксічную функцыю

**6. Адзначце практыкаванні на выпрацоўку словаўтваральных уменняў і навыкаў вучняў**
1) падабраць сказы прапанаванай структуры
2) размежаваць формы слова і аднакаранёвыя словы
3) падабраць да прапанаваных слоў аднакаранёвыя
4) падабраць словы прапанаванай структуры

**7. Адзначце практыкаванні на выпрацоўку словаўтваральных уменняў і навыкаў вучняў**
1) вызначаць спосабы ўтварэння прапанаваных для аналізу слоў
2) выправіць памылкі ва ўтварэнні слоў і іх форм
3) расставіць знакі прыпынку
4) напісаць склонавыя канчаткі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## 11. МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ МАРФАЛОГІІ

**1. Адукацыйныя задачы вывучэння марфалогіі заключаюцца ў тым, каб**

1) сфарміраваць у вучняўць веды пра марфалагічны лад беларускай мовы як сістэму

2) паказаць функцыю моўных сродкаў у працэсе маўлення

3) развіваць граматычны лад мовы вучняў

4) размяжоўваць часціны мовы

**2. Адзначце практычныя задачы засваення марфалогіі**

1) развіваць маўленне

2) выпрацоўваць арфаэпічныя навыкі

3) развіваць граматычны лад мовы вучняў

4) размяжоўваць часціны мовы

**3. Адзначце практычныя задачы засваення марфалогіі**

1) выконваць сінтаксічны разбор

2) размяжоўваць граматычныя катэгорыі

3) выконваць марфалагічны разбор

4) рыхтаваць базу для засваення сінтаксісу

**4. Адзначце мысліцельныя аперацыі, якія з'яўляюцца асноўнымі прыёмамі выкладання граматыкі**

1) параўнанне

2) аналіз, сінтэз

3) абагульненне

4) адасабленне

**5. Адзначце спецыфічны прынцыпы выкладання марфалогіі**

1) прынцып даступнасці

2) прынцып адзінства формы і зместу

3) прынцып узаемасувязі розных узроўняў мовы

4) прынцып функцыянальнай накіраванасці авалодання граматыкай

**6. Адзначце спецыфічны прынцыпы выкладання марфалогіі**

1) прынцып вывучэння марфалогіі на сінтаксічнай аснове

2) камунікатыўна-дзейнасны прынцып

3) прынцып навуковасці

4) прынцып даступнасці

**7. Які прынцып не дапускае аднабаковага падыходу да аналізу моўных з'яў?**

1) прынцып адзінства формы і зместу

2) прынцып узаемасувязі розных узроўняў моўнай структуры і ўнутрыўзроўневых сувязей

3) прынцып функцыянальнай накіраванасці авалодання граматыкай

4) прынцып вывучэння марфалогіі на сінтаксічнай аснове



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**8. Які прынцып мае на ўвазе ўстанаўленне залежнасці паміж адзінкамі аднаго ўзроўню мовы, а таксама розных узроўняў моўнай сістэмы**

1) прынцып адзінства формы і зместу

2) прынцып узаемасувязі розных узроўняў моўнай структуры і ўнутрыўзроўневых сувязей

3) прынцып функцыянальнай накіраванасці авалодання граматыкай

4) прынцып вывучэння марфалогіі на сінтаксічнай аснове

**9. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы "Назоўнік" вучні павінны ўмець**

1) распазнаваць назоўнікі ў тэкстах у пачатковай форме і ва ўскосных склонах

2) выкарыстоўваць нескланяльныя назоўнікі ў вусных і пісьмовых выказваннях

3) рабіць марфалагічны разбор назоўнікаў

4) выкарыстоўваць прыметнікі ў вусных і пісьмовых выказваннях

**10. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы "Прыметнік" вучні павінны ўмець**

1) рабіць марфалагічны разбор назоўнікаў

2) знаходзіць прыметнікі і апорныя словазлучэнні ў тэксце

3) утвараць і правільна ўжываць формы ступеней параўнання прыметнікаў

4) рабіць марфалагічны разбор прыметнікаў

**11. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы "Лічэбнік" вучні павінны ўмець**

1) правільна вымаўляць і пісаць лічэбнікі

2) рабіць марфалагічны разбор прыметнікаў

3) спалучаць з назоўнікамі лічэбнікі *два, дзве, двое, абодва, абедзве*

4) спалучаць з назоўнікамі лічэбнікі *тры, трое, паўтара, паўторы*

**12. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы "Лічэбнік" вучні павінны ўмець**

1) правільна карыстацца лічэбнікамі пры абазначэнні даты, свята, прыблізнай колькасці

2) рабіць марфалагічны разбор лічэбнікаў

3) спалучаць прыметнікі з назоўнікамі

4) рабіць марфалагічны разбор дзеяслова

**13. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы "Лічэбнік" вучні павінны ўмець**

1) спалучаць з назоўнікамі лічэбнікі

2) знаходзіць у тэксце дзеясловы і дзеяслоўныя словазлучэнні

3) суадносіць дзеясловы з аднакаранёвымі словамі іншых часцін мовы

4) вызначаць сэнсава-граматычную ролю дзеясловаў у тэкстах

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**14. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Дзеяслоў” вучні павінны ўмець**

1) ужываць дзеясловы ў прамым і пераносным значэнні

2) карыстацца дзеясловамі-сінонімамі

3) рабіць марфалагічны разбор назоўнікаў

4) спалучаць прыметнікі з назоўнікамі

**15. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Дзеяслоў” вучні павінны ўмець**

1) рабіць марфалагічны разбор лічэбнікаў

2) карыстацца дзеясловамі-антонімамі

3) правільна ўжывываць у сказах дзеясловы прошлага часу пры назоўніках, якія абазначаюць прафесіі, пасады, званні

4) рабіць марфалагічны разбор дзеясловаў

**16. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Дзеепрыметнік” вучні павінны ўмець**

1) знаходзіць у тэксце дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты

2) вызначаць ролю дзеепрыметнікаў у тэкстах

3) рабіць марфалагічны разбор лічэбнікаў

4) спалучаць з назоўнікамі лічэбнікі

**17. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Дзеепрыметнік” вучні павінны ўмець**

1) рабіць марфалагічны разбор прыметнікаў

2) правільна ўжываць дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу

3) інтанаваць сказы з дзеепрыметнікавымі зваротамі

4) рабіць марфалагічны разбор назоўнікаў

**18. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Дзеепрыметнік” вучні павінны ўмець**

1) карыстацца дзеясловамі

2) спалучаць прыметнікі з назоўнікамі

3) замяняць дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты іншымі моўнымі сродкамі

4) рабіць марфалагічны разбор дзеепрыметнікаў

**19. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Дзеепрыслоўе” вучні павінны ўмець**

1) знаходзіць у тэксце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты

2) рабіць марфалагічны разбор дзеепрыметнікаў

3) абгрунтаваць мэтазгоднасць ужывання дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў

4) рабіць марфалагічны разбор дзеепрыметнікаў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**20. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Дзеепрыслоўе” вучні павінны ўмець**

1) знаходзіць у тэксце дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты

2) карыстацца варыянтамі, сінанімічнымі дзеепрыслоўям

3) рабіць марфалагічны разбор дзеепрыслоўяў

4) рабіць марфалагічны разбор лічэбнікаў

**21. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Прыслоўе” вучні павінны ўмець**

1) знаходзіць у тэксце прыслоўі

2) вызначаць сэнсава-граматычную і стылістычную ролю прыслоўяў

3) вызначаць спосаб утварэння прыслоўяў

4) знаходзіць у тэксце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты

**22. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Прыслоўе” вучні павінны ўмець**

1) рабіць марфалагічны разбор лічэбнікаў

2) рабіць марфалагічны разбор прыметнікаў

3) правільна пісаць прыслоўі

4) правільна карыстацца формамі ступеней параўнання прыслоўяў

**23. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Прыназоўнік” вучні павінны ўмець**

1) адрозніваць вытворныя прыназоўнікі ад самастойных часцін мовы

2) правільна ўжываць прыназоўнікі ў маўленні

3) знаходзіць у тэксце дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты

4 рабіць марфалагічны разбор лічэбнікаў

**24. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Прыназоўнік” вучні павінны ўмець**

1) спалучаць з назоўнікамі лічэбнікі

2) рабіць марфалагічны разбор назоўнікаў

3) выкарыстоўваць спецыфічныя для беларускай мовы спалучэнні прыназоўнікаў з назоўнікамі, займеннікамі

4) рабіць марфалагічны разбор прыназоўнікаў

**25. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Злучнік” вучні павінны ўмець**

1) находзіць злучнікі ў тэкстах, вызначаць іх ролю

2) ужываць злучнікі ў сказах з аднароднымі членамі

3) рабіць марфалагічны разбор прыназоўнікаў

4) правільна ўжываць прыназоўнікі ў маўленні

**26. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Злучнік” вучні павінны ўмець**

1) правільна карыстацца формамі ступеней параўнання прыслоўяў

2) правільна ўжываць прыназоўнікі ў маўленні



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) ужываць злучнікі ў складаных сказах

4) ужываць злучнікі для сувязі сказаў і частак тэксту

**27. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Злучнік” вучні павінны ўмець**

1) правільна выбіраць злучнікі (у адпаведнасці са значэннем і стылістычнай афарбоўкай), ужываць іх у маўленні

2) выкарыстоўваць спецыфічныя для беларускай мовы спалучэнні прыназоўнікаў з назоўнікамі, займеннікамі

3) карыстацца паўторам злучніка з мэтай узмацнення выразнасці маўлення

4) рабіць марфалагічны разбор злучнікаў

**28. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Часціца” вучні павінны ўмець**

1) знаходзіць часціцы ў тэксце

2) вызначаць ролю часціц у тэксце

3) ужываць злучнікі ў складаных сказах

4) правільна ўжываць прыназоўнікі ў маўленні

**29. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Часціца” вучні павінны ўмець**

1) знаходзіць злучнікі ў тэкстах, вызначаць іх ролю

2) складаць сказы з часціцамі, ужываць іх у маўленні

3) захоўваць правільную інтанацыю пры чытанні сказаў з часціцамі

4) ужываць злучнікі для сувязі сказаў і частак тэксту

**30. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Часціца” вучні павінны ўмець**

1) знаходзіць у тэксце прыслоўі

2) выкарыстоўваць спецыфічныя для беларускай мовы спалучэнні прыназоўнікаў з назоўнікамі, займеннікамі

3) карыстацца часціцамі як сродкам сувязі сказаў у тэксце

4) рабіць марфалагічны разбор часціц

**31. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Выклічнік” вучні павінны ўмець**

1) знаходзіць выклічнікі ў тэксце

2) вызначаць ролю выклічнікаў у тэксце

3) захоўваць правільную інтанацыю пры чытанні сказаў з часціцамі

4) правільна ўжываць прыназоўнікі ў маўленні

**32. Паводле патрабаванняў вучэбнай праграмы па беларускай мове ў выніку вывучэння тэмы “Выклічнік” вучні павінны ўмець**

1) знаходзіць часціцы ў тэксце

2) вызначаць сэнсаваграматычную і стылістычную ролю прыслоўяў

3) правільна чытаць сказы з выклічнікамі

4) ужываць выклічнікі ў маўленні

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## 12. МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ

**1. Якія групы паняццяў складаюць аснову навучання звязнаму маўленню?**

1) тэкст

2) стылі мовы

3) тыпы мовы

4) часціны мовы

**2. У якіх накірунках наладжваецца развіцця маўлення вучняў у школе**

1) развіцця арфаграфічнай пільнасці

2) авалоданне моўнымі нормамі

3) узбагачэнне слоўнікавага запасу і граматычнага ладу

4) фарміраванне ўменняў і навыкаў звязнага маўлення

**3. Адзначце прынцыпы методыкі развіцця звязнага маўлення**

1) прынцып адзінства і ўзаемасувязі развіцця і мыслення

2) прынцып адзінства формы і зместу

3) прынцып узаемасувязі вуснага і пмсьмовага маўлення

4) прынцып актыўнай камунікацыі

**4. Адзначце прынцыпы методыкі развіцця звязнага маўлення**

1) прынцыпфразавага скланення

2) прынцып апоры на тэкст у яго жанрава-стылёвай разнастайнасці

3) прынцып сувязі развіцця маўлення з вывучэннем лінгвістычнага матэрыялу і з вывучэннем літаратуры

4) прынцыпнагляднасці

**5. Прынцып методыкі развіцця звязнага маўлення заснаваны на дыялектычным адзінстве і ўзаемасувязі маўлення і мыслення называецца**

1) прынцып адзінства і ўзаемасувязі развіцця і мыслення

2) прынцып апоры на тэкст у яго жанрава-стылёвай разнастайнасці

3) прынцып узаемасувязі вуснага і пісьмовага маўлення

4) прынцып актыўнай камунікацыі

**6. Прынцып методыкі развіцця звязнага маўлення заснаваны на тым, што вуснае і пісьмовае маўленне – гэта дзве формы працэсу суразмоўніцтва паміж людзьмі з дапамогай мовы, называецца**

1) прынцып адзінства і ўзаемасувязі развіцця і мыслення

2) прынцып апоры на тэкст у яго жанрава-стылёвай разнастайнасці

3) прынцып узаемасувязі вуснага і пісьмовага маўлення

4) прынцып актыўнай камунікацыі

**7. У адпаведнасці з якім прынцыпам методыкі развіцця звязнага маўлення любое выказванне вучня павінна быць матываваным, накіраваным на дасягненне пэўнай мэты, адпавядаць пэўнай камунікатыўнай задачы?**



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1) прынцып адзінства і ўзаемасувязі развіцця і мыслення
2) прынцып апоры на тэкст у яго жанрава-стылёвай разнастайнасці
3) прынцып узаемасувязі вуснага і пісьмовага маўлення
4) прынцып актыўнай камунікацыі

**8. Прынцып методыкі развіцця звязнага маўлення, які прадугледжвае пры стварэнні ўласных выказванняў апору на звесткі пра тэкст, яго будову, тэму і асноўную думку, спосабы і сродкі сувязі сказаў у тэксце, называецца**

1) прынцып адзінства і ўзаемасувязі развіцця і мыслення
2) прынцып апоры на тэкст у яго жанрава-стылёвай разнастайнасці
3) прынцып узаемасувязі вуснага і пісьмовага маўлення
4) прынцып актыўнай камунікацыі

**9. Прынцып методыкі развіцця звязнага маўлення заснаваны на вывучэнні лінгвістычнага матэрыялу і мастацкай літаратуры, называецца**

1) прынцып адзінства і ўзаемасувязі развіцця і мыслення
2) прынцып узаемасувязі вуснага і пмсьмовага маўлення
3) прынцып сувязі развіцця маўлення з вывучэннем лінгвістычнага матэрыялу і з вывучэннем літаратуры
4) прынцып актыўнай камунікацыі

**10. Асноўнымі метадамі і прыёмамі працы па развіцці звязнага маўлення з'яўляюцца**

1) прыёмы функцыянальна-стылістычнай працы з тэкстам
2) прыёмы працы з тэкстамі розных функцыянальна-сэнсавых тыпаў (апавяданне, апісанне, разважанне)
3) прыёмы тлумачэння
4) прыёмы вымаўлення

**11. Асноўнымі метадамі і прыёмамі працы па развіцці звязнага маўлення з'яўляюцца**

1) прыём паўтарэння
2) прыёмы працы над жанрамі маўлення
3) прыёмы навучання звязным выказванням
4) прыём замацавання

**12. Асноўнымі відамі творчых прац па развіцці звязнага маўлення вучняў з'яўляюцца**

1) дыктоўка 2) пераказ
3) пераклад 4) сачыненне

**13. Адзначце віды маўленчай дзейнасці**

1) аўдзіраванне
2) гаварэнне
3) чытанне
4) слуханне



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**14. Від работы, накіраваны на перадачу ў вуснай ці пісьмовай форме прачытанага ці ўспрынятага на слых тэксту, стварэнне тэксту на аснове дадзенага, называецца**

1) дыктоўка 2) пераказ
3) пераклад 4) сачыненне

**15. Па мэце правядзення адрозніваюцца пераказы**

1) навучальныя 2) кантрольныя
3) падрабязныя 4) індывідуальныя

**16. Па спосабе перадачы зыходнага тэксту адрозніваюцца пераказы**

1) кантрольныя 2) падрабязныя
3) сціслыя 4) выбарачныя

**17. Па характары тэкставага матэрыялу адрозніваюцца пераказы**

1) апавяданні 2) апісанні
3) разважанні 4) пераклады

**18. Па ўспрыманні тэксту адрозніваюцца пераказы**

1) пераклад прачытанага тэксту
2) пераказ прачытанага тэксту
3) пераказ пачутага тэксту
4) пераказ тэксту, успрынятага на слых і зрокава

**19. Па ступені самастойнасці выканання адрозніваюцца пераказы**

1) індывідуальныя 2) калектыўныя
3) аўтарскія 4) групавыя

**20. Па мэце правядзення адрозніваюцца сачыненні**

1) навучальныя 2) кантрольныя
3) падрабязныя 4) індывідуальныя

**21. Па месцы правядзення адрозніваюцца сачыненні**

1) бібліятэчныя 2) класныя
3) дамашнія 4) камп'ютарныя

**22. Паводле крыніцы атрымання інфармацыі адрозніваюцца сачыненні**

1) на аснове вопыту і асабістых назіранняў вучняў
2) па карціне
3) на літаратурныя і вольныя тэмы
4) па асаблівасцях маўленчай сітуацыі

**23. Па тыпу тэксту адрозніваюцца сачыненні**

1) апавяданні 2) апісанні
3) разважанні 4) пераклады

**24. Паводле абёму адрозніваюцца сачыненні**

1) падрабязныя 2) разгорнутыя
3) мініяцюры 4) сціслыя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**25. У залежнасці ад жанру адрозніваюцца сачыненні**

1) апавяданне 2) водгук
3) нататка 4) рэмарка

**26. Праца над сачыненнем дазваляе фарміраваць у вучняў такія камунікатыўна-маўленчыя ўменні, як**

1) уменне выразна чытаць тэкст
2) уменне разумець тэму, асэнсоўваць яе межы і паслядоўнасць раскрыцця
3) уменне збіраць і сістэматызаваць матэрыял для сачынення
4) уменне планаваць выказванне і будаваць яго ў адпаведнасці з планам

**27. Праца над сачыненнем дазваляе фарміраваць у вучняў такія камунікатыўна-маўленчыя ўменні, як**

1) уменне ствараць выказванне ў адпаведным стылі і жанры
2) уменне чытаць творы мастацкай літаратуры
3) менне выказваць свае думкі ў адпаведнасці з нормамі літаратурнай мовы, задачамі выказвання і асаблівасцямі маўленчай сітуацыі
4) уменне знаходзіць у тэксце памылкі і недахопы, удасканальваць выказванне

**28. Паводле жанрава-стылістычных асаблтвасцей тэксту выдзяляюцца пераклады**

1) пераклад апавяданняў
2) пераклад тэкстаў навуковага стылю
3) пераклад тэкстаў публіцыстычнага стылю
4) пераклад апавяданняў

**29. Паводле жанрава-стылістычных асаблтвасцей тэксту выдзяляюцца пераклады**

1) пераклад апісанняў
2) пераклад апавяданняў
3) пераклад тэкстаў афіцыйна-парававога стылю
4) пераклад тэкстаў гутарковага стылю

**30. Паводле адпаведнасці арыгіналу выдзяляюцца пераклады**

1) адэкватныя 2) вольныя
3) падрабязныя 4) сціслыя

## 14. МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СІНТАКСІСУ

**1. Адзначце этапы навучання сінтаксісу.**

1) прапедэўтычны
2) сінтаксічны курс
3) замацаванне і паглыбленне ведаў у працэсе засваення марфалогіі.
4) паўторны
5) выхаваўчы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**2. Адзначце задачы вывучэння сінтаксісу**
1) засваенне фанетычных прымет сінтаксічных паняццяў
2) засваенне структурных прымет сінтаксічных паняццяў
3) засваенне семантычных прымет сінтаксічных паняццяў
4) фарміраванне разумення сінтаксічнага ладу мовы як сістэмы
5) практычнае авалодванне лексікай беларускай мовы

**3. Адзначце задачы вывучэння сінтаксісу**
1) практычнае авалодванне сінтаксісам беларускай мовы
2) фарміраванне трывалых пунктуацыйных навыкаў
3) фарміраванне разумення лексічнага ладу мовы
4) выхаванне і развіццё вучняў
5.) фарміраванне арфагрвфічных навыкаў

**4. Адзначце прыметы словазлучэння**
1) абазначае прадмет
2) мае значэнне прэдыкатыўнасці
3) падпарадкавальная сувязь кампанентаў
4) не з'яўляецца камунікатыўнай адзінкай
5) служыць для сувязі слоў у сказе

**5. Адзначце прыметы сказа**
1) абазначае з'явы рэальнага свету
2) найменшая адзінка моўных зносін
3) двухбаковая граматычная сувязь паміж галоўнымі членамі
4) з'яўляецца намінатыўнай адзінкай
5) з'яўляецца камунікатыўнай адзінкай

**6. Адзначце прынцыпы вывучэння сінтаксісу:**
1) вывучэнне сінтаксічных паняццяў на марфалагічнай аснове
2) на аснове фанетычнага аналізу мовы
3) на аснове інтанацыйнага аналізу мовы
4) на аснове сэнсавага аналізу мовы
5) на аснове графічнага аналізу мовы

**7. Адзначце метады працы на ўроках навучэння сінтаксісу:**
1) аналіз марфалагічных з'яў
2) аналіз фанетычных асаблівасцей
3) інтанацыйны аналіз тэкстаў
4) аналіз сінтаксічных з'яў
5) чляненне тэксту на лагічна-сінтаксічныя часткі

**8. Адзначце метады працы на ўроках вывучэння сінтаксісу.**
1) параўнанне сінтаксічных з'яў
2) супастаўленне сінтаксічных з'яў
3) лексічны разбор
4) складанне сінтаксічных схем
5) напаўненне схем новым матэрыялам



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**9. Адзначце метадычныя прыёмы працы на ўроках вывучэння сінтаксісу.**

1) сінтаксічнае мадэляванне
2) рэдагаванне тэкстаў
3) сінтаксічны разбор
4) сінтаксічны эксперымент
5) развіццё фанематычнага слыху

**10. Адначце задачы граматыка-стылістычных практыкаванняў:**

1) асэнсоўваць лексічнае значэнне слоў
2) выконваць марфемны аналіз
3) асэнсоўваць адносіны паміж часткамі сказаў
4) вызначаць граматычнае значэнне сказаў
5) вызначаць будову сінтаксічных адзінак

## 14. МЕТОДЫКА ПАЗАКЛАСНАЙ ПРАЦЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**1. Адзначце мэты пазакласнай працы па беларускай мове**

1) падтрымліваць цікавасць да беларускай мовы як да вучэбнага прадмета і як да духоўнага здабытку народа

2) фарміраваць нацыянальна свядомую асобу, яе менталітэт

3) развіваць моўную культуру, пашыраць агульны і лінгвістычны кругагляд вучняў

4) выпрацоўваць арфаграфічныя ўменні

**2. Адзначце задачы пазакласнай працы па беларускай мове**

1) развіваць марфалагічныя ўменні вучняў
2) дапоўніць веды, уменні і навыкі вучняў па мове, атрыманыя на ўроках
3) навучыць дзяцей самастойна працаваць з кнігай
4) развіваць творчыя здольнасці вучняў

**3. Адзначце задачы пазакласнай працы па беларускай мове**

1) выхоўваць пашану да роднага слова, жаданне карыстацца ім у паўсядзённым жыцці

2) узбагачаць слоўнікавы запас вучняў
3) развіваць сінтаксічныя ўменні вучняў
4) развіваць пунктуацыйныя ўменні вучняў

**4. Адзначце прынцыпы арганізацыі пазакласных мерапрыемтваў**

1) прынцып абавязковасці
2) прынцып добраахвотнасці
3) прынцып узаемасувязі класных і пазакласных заняткаў
4) прынцып адказнасці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**5. Адзначце прынцыпы арганізацыі пазакласных мерапрыемтваў**
1) прынцып забаўляльнасці
2) прынцып прымусовасці
3) прынцып займальнасці
4) прынцып нацыянальнага характару заняткаў

## 15. АРФАГРАФІЧНЫ РЭЖЫМ

**1. Відамі пісьмовых работ па беларускай мове з'яўляюцца:**
1) практыкаванне 2) тэсты
3) чарцёж 4) малюнкі
5) сачыненне
**2. Кантроль на ўроку здзяйсняецца:**
1) рацыянальны 2) паўрочны
3) тэматычны 4) прамежкавы
5) выніковы
**3. Колькасць абавязковых кантрольных работ у 6 класе 11-гадовай школы:**
1) сачыненні 2 2) пераклады 2
3) дыктанты 4 4) пераказы 2
5) пісьмо па памяці
**4. Аб'ём тэкставага кантрольнага дыктанта ў 6 класе школы з рускай мовай навучання**
1) 100-110 2) 130-170
3) 80-100 4)110-130
5) 170-190
**5. Аб'ём тэкставага кантрольнага дыктанта ў 7 класе школы з рускай мовай навучання**
1) 100-110 2) 130-170
3) 80-100 4) 110-130
5) 170-190
**6. Аб'ём тэкставага кантрольнага дыктанта ў 8 класе школы з рускай мовай навучання**
1) 100-110 2) 130-170
3) 80-100 4)110-130
5) 170-190
**7. Узровень насычанасці тэкстаў арфаграмамі / пунктаграмамі:**
1) 6 клас – 16 /3-4 2) 7 клас – 20 / 4-5
3) 9 клас – 23 / 5-6 4) 8 клас – 24 / 2-3
5) 10 клас – 25 / 14-20



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**8. Аб’ём слоўнікавага дыктанта:**

1) 8 клас – 10-15
2) 10 клас – 30-40
3) 6 клас – 15-20
4) 9 клас – 25-30
5) 7 клас – 20-25

**9. Аб’ём тэкстаў для пераказу ў школе з рускай мовай навучання:**

1) 6 клас – 120-180
2) 7 клас – 180-220
3) 8 клас – 250-350
4) 9 клас – 340-450
5) 10 клас – 500-600

**10. Прыкладны аб’ём сачыненняў:**

1) 6 клас – 1-2 с.
2) 7 клас – 1-1,5 с.
3) 8 клас – 1,5-2 с.
4) 9 клас – 2-3 с.
5) 10 клас – 5-6

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Дадатак 1**

# ПАКАЗЧЫКІ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ЎРОКА І СІСТЭМЫ ЎРОКАЎ, ПРЫНЦЫПЫ АНАЛІЗУ ЎРОКА

Важнейшым паказчыкам эфектыўнасці працы настаўніка беларускай мовы, асноўным крытэрыем яго майстэрства і вопыту з'яўляецца вынік – асоба вучня, яго веды, уменні і навыкі, набытыя на ўроку, жаданне вучыцца, уменне самастойна здабываць веды, прымяняць іх у новых сітуацыях, адносіны да прадмета, да мовы свай го народа.

Улік усіх патрабаванняў да ўрока прымушае настаўніка асабліва ўважліва адносіцца да падрыхтоўкі плана (ход урока і дыдактычны матэрыял) ці канспекта (падрабязнае апісанне ўсяго ходу ўрока з магчымымі адказамі на пастаўленыя пытанні і выкананнем заданняў, запланаваных да ўрока). Вельмі важна пры падрыхтоўцы да ўрока наступнае: 1) пазнаёміцца з навуковай літаратурай па пытанні, тэме ўрока, паколькі, па-першае, для школы адбіраецца мінімальны аб'ём тэорыі і, зразумела, не ўсе навуковыя палажэнні асвятляюцца ў падручніку; па-другое, важна высветліць асновы тых ці іншых палажэнняў тэорыі ў школьным падручніку; 2) параўнаць з аб'ёмам, зместам падручніка; 3) пацікавіцца, як у навукова-метадычнай літаратуры прапануецца праводзіць урок па пэўнай тэме, вывучыць вопыт правядзення ўрокаў перадавых настаўнікаў, пажаданні метадыстаў і настаўнікаў-практыкаў; 4) вызначыць мэту і задачы ўрока; 5) устанавіць тып і структуру ўрока; 6) падабраць адпаведны мэце і задачам урока дыдактычны матэрыял; 7) скласці план, а для студэнта-практыканта і настаўніка-стажора канспект урока.

Пры вызначэнні паказчыкаў эфектыўнасці ўрока патрэбна зыходзіць з таго, што ўрок уяўляе сабой цэласную сістэму, развіццё якой вядзе да ўмацавання ўласцівых ёй асаблівасцей і характэрных для яе вынікаў. Адсюль:

1) розная сістэма ўрока мае свае паказчыкі эфектыўнасці;

2) паказчыкамі эфектыўнасці ўрока і сістэмы ўрокаў з'яўляюцца не толькі вынікі навучання;

3) паказчыкамі эфектыўнасці ўрока і сістэмы ўрока з'яўляецца сама будова ўрокаў;

4) дынаміка, характэрная для будовы ўрока і сістэмы ўрокаў, з'яўляючыся ўмовай і вынікам развіццёвага навучання, можа быць разгледжана ў якасці паказчыка іх эфектыўнасці;

5) ускладненне ў характары пазнавальнай дзейнасці вучняў у працэсе навучання, якое не выклікае разбалансаванасці паміж дзейнасцю настаўніка і вучняў і вядзе да дасягнення намечаных вынікаў, з'яўляецца замерам, які сведчыць аб эфектыўнасці ўсёй сістэмы;

6) факты разбалансаванасці паміж дзейнасцю настаўніка і вучняў пры замене традыцыйнай сістэмы навучання сістэмай, характэрнай для развіццёвага і іншага тыпу навучання, выяўляе супярэчнасці паміж былым вопытам навучання і новым узроўнем выкладання;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7) факты разбалансаванасці пры замене адной сістэмы правядзення ўрока другой дазваляюць выявіць тыя прыкметы, якія могуць быць разгледжаны ў якасці паказчыкаў эфектыўнасці ўрока.

Традыцыйная сістэма навучання, як правіла, праводзіцца з мэтай замацавання (спачатку тлумачэнне новага матэрыялу, дэманстрацыя нагляднасці, тлумачэнне і ўзоры спосабаў дзейнасці вучняў і тады прымяненне ведаў у практычнай рабоце вучняў). Пры гэтым практычная работа вучняў выконваецца паводле інструкцый настаўніка.

З мэтай актывізаваць разумовую дзейнасць вучняў і развіваць іх самастойнасць патрабуецца ў большай ступені выкарыстоўваць практычную работу ў якасці крыніцы новых ведаў. Практычная работа вучняў выкарыстоўваецца з мэтай стварэння праблемнай сітуацыі, служыць сродкам, які дае магчымасць вучням самастойна зрабіць вывады, унесці ў працу вучняў элемент даследавання і інш.

У выніку змены мэты практычнай работы вучняў: праводзіцца яна з мэтай замацавання гатовых ведаў і спосабаў дзейнасці ці яна з'яўляецца крыніцай новага, – змяняецца характар пазнавальнай дзейнасці ўвогуле. У першым выпадку яна набывае статус выканання, у другім – даследавання.

Метадычная літаратура прапануе розныя схемы аналізу ўрока (гл.: Текучев А.В. Методика русского языка в средней школе. – М.: Просвещение, 1980. – С. 128–130; Онищук В.А. Урок в современной школе. – М.: Просвещение, 1981. – С. 186–190; Ляшчынская В.А. Аналіз урока беларускай мовы // Ляшчынская В.А., Смыкоўская В.І. Педагагічная практыка студэнтаў-філолагаў. – Мінск: Вышэйшая школа, 1983. – С. 100–105 і інш.). На нашу думку, важнейшым пры аналізе ўрока з'яўляецца вызначэнне прынцыпаў, якімі патрэбна кіравацца пры гэтым. Педагагічная каштоўнасць урока вызначаецца наступнымі крытэрыямі:

**І. Структурнымі:**

1) дакладнасць мэтавай устаноўкі ўрока. Адпаведнасць метадаў і прыёмаў працы вызначанай мэты. Усё: кожны момант урока, кожнае практыкаванне – павінны быць падпарадкаваны вызначанай мэце;

2) правільнасць вызначэння і дакладнасць фармулёўкі тэмы ўрока. Адпаведнасць адабранага матэрыялу ўрока тэме;

3) месца кожнага ўрока ў сістэме ўрокаў па дадзенаму раздзелу. З'яўляючыся самастойным і цэласным звяном вучэбнага працэсу, кожны ўрок у той жа час павінен быць працягам папярэдняга і падрыхтоўкай да;

4) адпаведнасць структуры і мэты ўрока, метадычная мэтазгоднасць выбару і размяшчэння структурных элементаў урока, разнастайнасць відаў працы, арганізацыйная дакладнасць урока, цікавасць вучняў да ўрока;

5) адпаведнасць ходу ўрока яго плану і мэтазгоднасць, лагічная апраўданасць адступленняў;

6) раўнамернасць тэмпу ўрока, правільнае размеркаванне часу ўрока.

**ІІ. Змястоўнымі:**

1) выхаваўчая каштоўнасць урока. Пры аналізе ўрока з гэтага пункту гледжання варта звярнуць увагу на наступныя моманты: а) выхаваўчая каштоўнасць прыкладаў, ілюстрацый, прапанаваных настаўнікам, б) увага настаўніка да прыведзеных прыкладаў вучнямі, в) увага настаўніка і вучняў да зместу прыкладаў, асабліва тэкстаў,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

да выяўлення іх выхаваўчага патэнцыялу, г) свядомая дысцыпліна на ўроку, адносіны вучняў да вучобы, выкананне заданняў на ўроку, д) справядлівасць і абгрунтаванасць, матываванасць адзнак, е) уменне настаўніка трымацца ў класе, уважлівыя адносіны яго да вучняў і да т. п.;

2) навуковы змест урока і правільнасць выкладу матэрыялу, дакладнасць тэрміналогіі;

3) змест і характар прыкладаў, тэкстаў, скарыстаных на ўроку, іх стылістычны ўзровень (даступнасць пры адсутнасці прымітыўнасці, адпаведнасць тэме, адпаведнасць узроставым асаблівасцям вучняў, пажаданасць міжпрадметных сувязей, адзінства ў тэматычным і лексічным планах);

4) разнастайнасць і метадычная абгрунтаванасць відаў практыкаванняў, прапанаваных вучням на ўроку, іх адпаведнасць як агульнай мэце ўсяго ўрока, так і мэце кожнага этапа ўрока;

5) правільнае і мэтазгоднае выкарыстанне падручніка на ўроку (выкананне практыкаванняў, чытанне новага матэрыялу, самастойны аналіз матэрыялу і інш.);

6) дакладнасць, правільнасць і даходлівасць зробленых вынікаў урока;

7) апраўданасць і мэтазгоднасць хатняга задання, адпаведнасць яго тэме, узорам выканання на ўроку;

8) выразнасць, даступнасць мовы настаўніка; правільнае афармленне пытанняў;

9) ступень актыўнасці вучняў, удзел у працы кожнага;

10) вынікі ўрока, узровень навыкаў і ўменняў, атрыманых на ўроку.

**Дадатак 2**

# ПРЫКЛАДНАЯ СХЕМА АНАЛІЗУ ЎРОКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

## I

1. Тып і структура ўрока.
2. Правільнасць фармулёўкі тэмы і вызначэнне мэты ўрока, яго адпаведнасць вучэбнай праграме.
3. Выхавальная накіраванасць урока.
4. Метады і прыёмы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці і самастойнай працы вучняў, навуковасць, даступнасць выкладу новага матэрыялу.
5. Віды практыкаванняў, іх сістэма, метадычная вартасць і роля ў арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў, якасць дыдактычнага матэрыялу.
6. Прыёмы развіцця вуснай і пісьмовай мовы вучняў.
7. Сувязь новага матэрыялу з раней вывучаным, пераемнасць і перспектыўнасць у выкладанні.
8. Прыёмы замацавання і абагульнення новага матэрыялу.
9. Спосабы і якасць праверкі і ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў вучняў.
10. Прымяненне наглядных дапаможнікаў, тэхнічных сродкаў навучання, іх дыдактычная апраўданасць, эфектыўнасць і правільнасць выкарыстання на розных этапах урока.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

11. Вызначэнне дамашняга задання, інструктаж па яго выкананню, адпаведнасць задання мэтам урока, дыферэнцыраваны падыход да вызначэння задання ўсяму класу і асобным вучням.

## II

1. Уменне настаўніка трымацца ў класе (упэўненасць, сабранасць, знаходлівасць, ініцыятыва), працаваць аднача- сова з усім класам і асобнымі вучнямі.

2. Веданне настаўнікам вучэбнага матэрыялу, метадычнае майстэрства.

3. Мова (дыкцыя, тэмп, культура ~~маўлення,~~ эмацыянальнасць), тэмп працы, манера і знешні выгляд настаўніка.

4. Педагагічны такт настаўніка.

## III

1. Дасягненне пастаўленай мэты ўрока.

2. Ступень засваення вучнямі новага матэрыялу.

3. Агульная арганізацыя ўрока.

4. Вывады, заўвагі да ўрока, парады і пажаданні для паляпшэння якасці вучэбна-выхавальнай працы на ўроку.

Прапанаваны пералік пытанняў пры аналізе ўрокаў беларускай мовы не вычэрпвае ўсіх момантаў, якія могуць узнікнуць на практыцы. У залежнасці ад мэты віды аналізу могуць быць наступныя: структурны (паэтапны), аспектны (паэлементны), сістэмны, комплексны (поўны), экспрэс-аналіз. Структурны аналіз урока выкарыстоўваецца з мэтай характарыстыкі і ацэнкі яго ўнутранай арганізацыі ў адпаведнасці са структурай (па асобных этапах). Калі ўзнікае неабходнасць у карэкціроўцы працы настаўніка ці вывучэнні яго вопыту, праводзіцца аспектны аналіз, звязаны з асэнсаваннем асобных элементаў прафесійнай дзейнасці: спосабы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, формы кантролю і ацэнкі і інш. Экспрэс-аналіз – кароткі аналіз урока з агульнай яго характарыстыкай. Пры комп- лексным аналізе ўрока навучальны працэс разглядаецца як адзінае цэлае ва ўзаемасувязі мэты, зместу, форм і метадаў навучання. Сістэмны аналіз прадугледжвае аналіз не аднаго, а сістэмы ўрокаў – сістэмы працы настаўніка. Апошні від аналізу і ацэнкі педагагічнай дзейнасці лічыцца: найбольш аптымальным і аб’ектыўным.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Дадатак 3**

# ІНСТРУКТЫЎНА-МЕТАДЫЧНАЕ ПІСЬМО МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «Аб арганізацыі ў 2018/2019 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі»

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ. АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ў 2018/2019 навучальным годзе абумоўлены:

– забеспячэннем роўных умоў для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ва ўсіх відах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі;

– працягам паэтапнага пераходу на абноўленыя вучэбныя праграмы па ўсіх вучэбных прадметах у IV і VIII класах.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 студзеня 2018 г. № 30 «Аб прыёме ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі і навучанні ў іх» прыём для атрымання базавай адукацыі ў гімназіях, гімназіях-інтэрнатах, гімназіях-каледжах мастацтваў ажыццяўляецца без уступных выпрабаванняў, ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі асобныя вучэбныя прадметы могуць вывучацца на павышаным узроўні.

Згодна з пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 3 сакавіка 2018 г. № 10 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2011 г. № 283» на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі могуць ствараецца класы (групы) з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні. Вывучэнне асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні можа ажыццяўляцца на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі як у гімназіях, гімназіях-інтэрнатах, так і ў базавых школах, сярэдніх школах, школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У сярэдніх школах, школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, вывучэнне асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні можа ажыццяўляцца таксама і на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Пры гэтым на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні з V класа можа вывучацца вучэбны прадмет «Замежная мова», а з VIII класа – любы вучэбны прадмет (любыя вучэбныя прадметы) з ліку вучэбных прадметаў, вызначаных тыпавым вучэбным планам агульнай сярэдняй адукацыі на 2018/2019 навучальны год для абавязковага вывучэння.

Дадатковыя вучэбныя гадзіны ў тыдзень (адна або дзве) на вывучэнне аднаго або двух вучэбных прадметаў на павышаным узроўні ў VIII класе рэкамендуецца выкарыстоўваць на стымуляванне вучэбнай дзейнасці вучняў па авалоданні сістэмнымі ведамі, уменнямі, навыкамі, набыццю вопыту дзейнасці пры аперыраванні імі, развіццё



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўласцівасцей і якасцей асобы вучняў, іх творчых здольнасцей і фарміраванне на іх аснове прадметных, метапрадметныя і асобасных кампетэнцый. Варыянты прыкладнага размеркавання дадатковых гадзін на вывучэнне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні прадстаўлены ў прадметных дадатках да дадзенага інструктыўна-метадычнага пісьма.

Актуальнымі застаюцца пытанні ўзмацнення міжпрадметных сувязей пры вывучэнні вучэбных прадметаў, а таксама выхаваўчага патэнцыялу вучэбных заняткаў не толькі праз змест вучэбнага матэрыялу, але і з дапамогай розных форм і спосабаў арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Да новага навучальнага года:

– зацверджаны тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі на 2018/2019 навучальны год (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 11 мая 2018 г. № 43);

– вызначана працягласць чвэрцей і канікул у 2018/2019 навучальным годзе (пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 16 сакавіка 2018 г. № 02-01-19/2314/дс «Аб завяршэнні 2017/2018 навучальнага года і правядзенні выпускных экзаменаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі»);

– вызначаны пералік вучэбных прадметаў, па якіх праводзяцца выпускныя экзамены, формы правядзення выпускных экзаменаў пры правядзенні ў 2018/2019 навучальным годзе выніковай атэстацыі вучняў (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2018 г. № 59);

– скарэкціраваны змест вучэбных праграм па ўсіх вучэбных прадметах для IV, VIII класаў;

– распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з абноўленымі вучэбнымі праграмамі.

## НАРМАТЫЎНАЕ ПРАВАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

Палажэнне аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанае пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2011 г. № 283 (у рэдакцыі пастаноў Міністэрства адукацыі ад 04.02.2014 № 9, ад 10.04.2014 № 38, ад 27.11.2017 № 148, ад 03.03.2018 № 10) (далей – Палажэнне аб установе агульнай сярэдняй адукацыі);

Санітарныя нормы і правілы «Патрабаванні для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі», зацверджаныя пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2012 г. № 206 (у рэдакцыі пастаноў Міністэрства аховы здароўя ад 29.07.2014 № 63, ад 25.11.2014 № 78, ад 17.05.2017 № 35, ад 03.05.2018 № 39) (далей – Санітарныя нормы і правілы);

Правілы бяспекі пры арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах (дысцыплінах) «Хімія» і «Фізіка» ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, зацверджаныя пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 2008 г. № 26;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Пералік дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь, якія ўтвараюцца ў працэсе дзейнасці Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, структурных падраздзяленняў абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, што ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі і па справах моладзі, дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь, з указаннем тэрмінаў захоўвання, вызначаны ў дадатку да пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 24 мая 2012 г. № 52;

Пералік дакументаў, абавязковых для вядзення асобнымі педагагічнымі работнікамі ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, вызначаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2017 г. № 164;

Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў агульнаадукацыйных устаноў па вучэбных прадметах, зацверджаныя загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 29 мая 2009 г. № 674 (у рэдакцыі загадаў Міністэрства адукацыі ад 18.06.2010 № 420, ад 29.09.2010 № 635);

Правілы правядзення атэстацыі вучняў пры асваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджаныя пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2011 г. № 38 (далей – Правілы правядзення атэстацыі);

Пералік вучэбных прадметаў, па якіх праводзяцца выпускныя экзамены, форм правядзення выпускных экзаменаў пры правядзенні ў 2018/2019 навучальным годзе выніковай атэстацыі вучняў пры асваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2018 г. № 59;

Інструкцыя аб парадку вызначэння аплачваемых гадзін арганізацыйна-выхаваўчай работы і дадатковага кантролю вучэбнай дзейнасці вучняў ва ўстановах адукацыі, зацверджаная пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2004 года № 70 (у рэдакцыі пастаноў Міністэрства адукацыі ад 07.10.2008 № 102, ад 07.10.2011 № 269, ад 22.07.2013 № 52).

Комплексную падтрымку ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу забяспечвае нацыянальны адукацыйны партал *(www.adu.by)*.

У дапамогу настаўнікам рэкамендуюцца наступныя раздзелы партала:

*«Нарматыўныя прававыя дакументы»* (у раздзеле прадстаўлены нарматыўныя прававыя акты, якія рэгламентуюць адукацыйную дзейнасць ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь): *http://adu.by/ru/69-uchitelyu/normativnye-pravovye-dokumenty.html.*

*«Адукацыйны працэс. 2018/2019 навучальны год»* (у раздзеле прадстаўлены тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі на 2018/2019 навучальны год; вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах; вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў; інструктыўна-метадычныя пісьмы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь; нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў; пералікі вучэбных выданняў для настаўнікаў і вучняў; каляндарна-тэматычнае планаванне; метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з абноўленымі вучэбнымі праграмамі і інш.): *http://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2018-2019-uchebnyj-god.html.* Раздзел структураваны па назвах вучэбных прадметаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*«Профільнае навучанне»* (у раздзеле прадстаўлены актуальныя матэрыялы па пытаннях арганізацыі дапрофільнай падрыхтоўкі і профільнага навучання): *http://www.adu.by/ru/homepage/prof-oby-1.html.*

*«Мерапрыемствы»* (у раздзеле прадстаўлена актуальная інфармацыя аб адукацыйных мерапрыемствах, у якіх могуць прыняць удзел педагогі, кіраўнікі ўстаноў адукацыі, спецыялісты рэгіянальных органаў кіравання адукацыяй, вучні): *http://www.adu.by/ru/uchitelyu/meropriyatiya-seminary-konferentsii-konkursy-i-dr.html.*

*«Педагагічная майстэрня»* (у раздзеле прадстаўлены артыкулы, сцэнарыі мерапрыемстваў, канспекты ўрокаў, відэаўрокі настаўнікаў па розных вучэбных прадметах і іншыя матэрыялы, накіраваныя на ўдасканаленне прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў): *http://www.adu.by/ru/uchitelyu/pedmasterskaya.html.*

*«Электроннае навучанне»* (у раздзеле прадстаўлены электронныя адукацыйныя рэсурсы (далей — ЭАР) для дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі: *http://e-vedy.adu.by*.

*«Дыстанцыйны ўсенавуч настаўніку»: http://e-asveta.adu.by*; інтэрнэт-рэсурс па суправаджэнні інтэрнэт-алімпіяд, турніраў і конкурсаў па вучэбных прадметах: *http://olimp.adu.by/.*

*«Электронныя версіі падручнікаў»* (у раздзеле прадстаўлены электронныя версіі падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі): *http://e-padruchnik.adu.by/.*

*«Конкурс на стварэнне вучэбных дапаможнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі»* (у раздзеле размешчаны «Парадак правядзення конкурсу на стварэнне вучэбных дапаможнікаў для ўстаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі Рэспублікі Беларусь», аб'явы аб конкурсах, якія праводзяцца, інфармацыя аб выніках праведзеных конкурсаў): *http://www.adu.by/ru/uchitelyu/konkurs-na-sozdanie-uchebnykh-posobij/dlya-uchrezhdenij-obshchego-srednego-obrazovaniya.html.*

*«Новыя вучэбныя праграмы: вывучаем, абмяркоўваем»* (у раздзеле прадстаўлены абноўленыя вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі): *http://www.adu.by/ru/2-uncategorised/1082-novye-uchebnye-programmy.html.*

*«Новыя падручнікі: вывучаем, абмяркоўваем»* (у раздзеле размешчаны новыя вучэбныя дапаможнікі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, распрацаваныя аўтарскімі калектывамі — пераможцамі конкурсу на стварэнне вучэбных дапаможнікаў): *http://www.adu.by/ru/2-uncategorised/1071-uvazhaemye-posetiteli-natsionalnogo-obrazovatelnogo-portala-http-adu-by.html.*

З прапановамі і заўвагамі па змесце абноўленых вучэбных праграм і новых вучэбных дапаможнікаў можна звяртацца на інфалінію партала.

*«Супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД у сферы адукацыі»* (у раздзеле прадстаўлена інфармацыя аб міжнародных даследаваннях якасці адукацыі; адукацыйных рэсурсах для педагогаў; міжнародных канферэнцыях, семінарах, форумах, фестывалях і інш.): *http://www.adu.by/ru/uchitelyu/sotrudnichestvo-gosudarstv-uchastnikov-sng.html.*

*«Арганізацыя выхавання»* (у раздзеле размешчаны нарматыўныя прававыя акты, інструктыўна-метадычныя матэрыялы ў сферы выхавання і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, якая вучыцца, тыпавыя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, артыкулы па тэорыі і практыцы выхавання): *http://www.adu.by/ru/uchitelyu/organizatsiya-vospitaniya.html.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Дадатак 4**

# АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАЎ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

**Асноўнымі мэтамі моўнай і літаратурнай адукацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляюцца:**

фарміраванне сістэмы ведаў пра мову і маўленне, уменняў карыстацца беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці, развіццё камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай і мастацка-эстэтычнай культуры вучняў;

далучэнне вучняў да мастацтва слова і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным светапоглядам, з развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі.

**У 2018/2019 навучальным годзе выкарыстоўваюцца наступныя вучэбныя праграмы:**

**Беларуская мова. Беларуская літаратура**

**V–VII, IX класы:**

Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова. Беларуская літаратура. V–IX класы. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017;

Беларуская мова. VII клас // Зборнік вучэбных праграм для VII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017;

Беларуская мова. VII клас // Сборник учебных программ для VII класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017;

Беларуская літаратура. VII клас // Зборнік вучэбных праграм для VII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017;

Беларуская літаратура. VII клас // Сборник учебных программ для VII класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. — Минск : Нац. ин-т образования, 2017;

**VIII клас:**

Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова. Беларуская літаратура. VIII клас. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018;

Беларуская мова. VIII клас // Зборнік вучэбных праграм для VIII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018;

Беларуская мова. VIII клас // Сборник учебных программ для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. – Минск : Нац. ин-т образования, 2018;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Беларуская літаратура. VIII клас // Зборнік вучэбных праграм для VIII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018;

Беларуская літаратура. VIII клас // Сборник учебных программ для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. – Минск : Нац. ин-т образования, 2018;

**X–XI класы:**

Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова. Беларуская літаратура. X–XI класы (базавы ўзровень). – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017;

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для X класа (павышаны ўзровень) // Вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання. X клас (павышаны ўзровень). – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015;

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для X класа (павышаны ўзровень) // Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. X класс (повышенный уровень). – Минск : Нац. ин-т образования, 2015;

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для XI класа (павышаны ўзровень) // Вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання. XI клас (павышаны ўзровень). – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016;

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для XI класа (павышаны ўзровень) // Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. XI класс (повышенный уровень). – Минск : Нац. ин-т образования, 2016;

Вучэбная праграма для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская літаратура. X–XI класы (павышаны ўзровень), 2017 // нацыянальны адукацыйны партал (http://adu.by).

Усе вучэбныя праграмы змешчаны на нацыянальным адукацыйным партале *www.adu.by / Образовательный процесс. 2018/2019 учебный год / Учебные предметы. V–XI классы.* ***Беларуская мова*** ***(Беларуская літаратура)***.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# АДКАЗЫ

| 1. А Д К А З Ы. Мэты, змест і структура моўнай адукацыі | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 3 | 2. 1 3 4 | 3. 2 3 5 | 4. 1 4 | 5. 2 3 4 |
| 6. 1 2 5 | 7. 2 4 5 | 8. 2 | 9. 2 4 | 10. 1 2 |
| 11. 1 2 3 | | | | |

| 2. А Д К А З Ы. Прадмет, задачы, фундаментальныя паняцці і навуковыя асновы методыкі выкладання беларускай мовы | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 3 | 2. 1 2 4 | 3. 2 3 4 | 4. 1 3 4 | 5. 2 3 4 5 |
| 6. 3 4 5 | 7. Метад навучання | 8. 1 2 3 4 | 9. 1 3 4 | 10. Дэдукцыя |
| 11. Індукцыя | 12. 3 | 13. 1 3 4 5 | 14. 1 2 3 | 15. 1 4 5 |

| 3. А Д К А З Ы. Прынцыпы навучання | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 3 4 | 2. 2 3 | 3. 1 2 | 4. 1 | 5. 2 |
| 6. 4 | 7. 1 | 8. 4 | 9. 3 | 10. 1 |
| 11. 4 | 12. 4 | 13. 1 | | |

| 4. А Д К А З Ы. Метады і прыёмы навучання беларускай мове | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 4 | 2. 1 2 3 | 3. 3 4 | 4. 1 2 | 5. 3 |
| 6. 1 3 | 7. 1 4 | 8. 2 4 | 9. 1 3 | 10. 1 3 4 |
| 11. 1 2 3 | 12. 2 3 4 | 13. | | |

| 5. А Д К А З Ы. Урок беларускай мовы | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 2 | 2. 1 2 4 | 3. 1 3 4 | 4. 2 3 | 5.1 3 |
| 6. 1 | 7. 3 | 8. 4 | 9. 1 | 10. 1 2 4 |
| 11. 1 2 4 | 12. 1 2 3 | | | |

| 6. А Д К А З Ы. Методыка выкладання арфаграфіі | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 4 5 | 2. 1 2 4 | 3. 2 3 4 | 4. 3 4 5 | 5. 1 2 4 5 |
| 6. 2 3 5 | 7. 1 2 4 | 8. 1 3 5 | 9. А2 Б1 В 3 | 10. А. 2 Б. 1 В 3 Г 4 Д 5 |

| 7. А Д К А З Ы. Методыка навучання пунктуацыі | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 4 | 2. 2 3 4 | 3. 1 2 3 | 4. 2 3 | 5. 1 2 3 |
| 6. 2 | 7. 4 | 8. 1 2 4 | 9. 2 3 4 | 10. 1 2 3 |

| 8. А Д К А З Ы. Методыка лексікі і фразеалогіі | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 | 2. 1 2 3 | 3. 1 4 | 4. 3 4 | 5. 2 3 |
| 6. 1 2 | 7. 2 4 | 8. 1 3 | 9. 2 3 | 10. 1 2 |
| 11. 123 | 12. 1 3 | 13. 1 | 14. 2 | 15. 3 |
| 16. 4 | 17. 1 3 | 18. 1 2 | 19. 1 | 20. 2 |
| 21. 3 | 22. 1 2 3 | 23. 1 2 4 | 24. 1 3 4 | 25. 2 3 4 |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| 9. А Д К А З Ы. Методыка фанетыкі | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 | 2. 3 4 | 3. 1 3 4 | 4. 2 4 | 5. 1 3 |
| 6. 2 3 | 7. 1 2 | 8. 3 4 | | |

| 10. А Д К А З Ы. Методыка вывучэння словаўтварэння | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 | 2. 1 3 4 | 3. 2 3 | 4. 1 2 | 5. 1 2 3 |
| 6. 2 3 4 | 7. 1 2 | | | |

| 11. А Д К А З Ы. Методыка выкладання марфалогіі | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 | 2. 3 4 | 3. 2 3 4 | 4. 1 2 3 | 5. 2 3 4 |
| 6. 1 2 | 7. 1 | 8. 2 | 9. 1 2 3 | 10. 2 3 4 |
| 11. 1 3 4 | 12. 1 2 | 13. 2 3 4 | 14. 1 2 | 15. 2 3 4 |
| 16. 1 2 | 17. 2 3 | 18. 3 4 | 19. 1 3 | 20. 2 3 |
| 21. 1 2 3 | 22. 3 4 | 23. 1 2 | 24. 3 4 | 25. 1 2 |
| 26. 3 4 | 27. 1 3 4 | 28. 1 2 | 29. 2 3 | 30. 3 4 |
| 31. 3 4 | | | | |

| 12. А Д К А З Ы. Методыка развіцця звязнага маўлення | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 3 | 2. 2 3 4 | 3. 1 3 4 | 4. 2 3 | 5. 1 |
| 6. 3 | 7. 4 | 8. 2 | 9. 3 | 10. 1 2 |
| 11. 2 3 4 | 12. 2 3 4 | 13. 1 2 3 | 14. 2 | 15. 1 2 |
| 16. 2 3 4 | 17. 1 2 3 | 18. 2 3 4 | 19. 1 2 | 20. 1 2 |
| 21. 2 3 | 22. 1 2 3 | 23. 1 2 3 | 24. 2 3 | 25. 1 2 3 |
| 26. 2 3 4 | 27. 1 3 4 | 28. 1 2 3 | 29. 2 3 4 | 30. 1 2 |

| 13. А Д К А З Ы. Методыка пазакласнай працы па беларускай мове | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 3 | 2. 2 3 4 | 3. 1 2 | 4. 2 3 | 5. 3 4 |

| 14. А Д К А З Ы. Методыка выкладання сінтаксісу | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 3 | 2. 2 3 4 | 3. 1 2 | 4. 1 3 4 | 5. 2 3 5 |
| 6. 1 3 4 | 7. 3 4 5 | 8. 1 2 4 5 | 9. 1 2 3 4 | 10. 3 4 5 |

| 15. А Д К А З Ы. Арфаграфічны рэжым | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1 2 5 | 2. 2 3 4 5 | 3. 3 4 | 4. 3 | 5. 1 |
| 6. 4 | 7. 1 2 4 | 8. 3 5 | 9. 1 2 3 | 10. 2 3 4 |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА


**Асноўная**

1. **Яленскі, М.Г.** Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка: вучэб. дапам. Длястудэнтаў філал. Спецыяльнасцей устаноў, якія Забяспечваюць атрыманне выш. Адукацыі / М.Г. Яленскі. – Мінск : Адукацыя і выхаванне , 2005. – 224 с.
2. Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М.Г. Яленскі [і інш.] ; пад рэд . М.Г.Яленскага.– Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007.
3. **Яленскі, М.Г.** Методыка выкладання беларускай мовы : практыкум : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М.Г. Яленскі, У.П. Саўко, Л.С. Васюковіч ; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2006. – 336 с.

**Дадатковая**

1. **Валочка, Г М.** Навучанне перакладу ў школе. – Мінск, 1999.
2. **Валочка, Г.М.** Развіццё звязнага маўлення школьнікаў. – Мінск, 2005.
3. **Варановіч, З.Б.** Практыкум па методыцы выкладання беларускай мовы : для студэнтаў філалагічнага факультэта : у 2 ч. Частка 1 : Агульныя пытанні выкладання методыкі / З.Б. Варановіч , Л.М. Гамеза, І.М.Саматыя, С.М. Крылова. – Мінск, 1998. – 31 с.
4. **Воителева, Т.М.** Теория и методика обучения русскому языку: учеб. пособие для вузов / Т.М. Воителева. – М. : Дрофа, 2006. – 319 с.
5. **Выгонная, Л.Ц.** Фанетыка беларускай мовы ў школе. – Мінск, 1995.
6. Выкладанне беларускай мовы ў школе / М.Г. Яленскі, Л.С. Васюковіч, І.М. Саматыя [і інш.]. – Мінск, 1994.
7. **Гамеза, Л.М.** Лінгваметадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў / Л.М. Гамеза. – Мінск, 2002.
8. **Даніловіч, М.А.** Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы. – Мінск, 1991.
9. **Ермаловіч, А.В.** Сачыненні-апісанні: тэорыя і практыка . – Мінск, 2005.
10. **Красней, В.П.** Грані слова : факультатыўны курс“Лексіка і фразеалогія беларускай мовы”. – Мінск, 1986.
11. **Лаўрэль, Я.М.** Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я.М. Лаўрэль, Т.Р. Новікава, С.А. Язерская. – Мінск, 1991.
12. **Литвинко, Ф.М.** Методика изучения разделов школьного курса русского языка (функциональный подход ) : курс лекций для студентов филологического факультета. – Минск : БГУ, 2001.
13. **Литневская, Е.И.** Методика преподавания русского языка в школе : учеб. пособие для студентов высших учебных заведений / Е.И. Литневская, В.А. Багрянцева. – М. : Академический проект, 2006. – 590 с.
14. **Ляшчынская, В.А.** Методыка выкладання беларускай мовы : задачы і практыкаванні. – Мінск, 1998.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

15. **Ляшчынская, В.А.** Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб. дапаможнік / В.А. Ляшчынская, З.У. Шведава. – Мінск : РІВШ, 2007. – 252с.
16. **Малажай, Г.М.** Алімпіяды па беларускай мове / Г.М. Малажай, В.П. Красней. – Мінск, 2001.
17. **Малажай, Г.М.** Пазакласная праца па беларускай мове / Г.М. Малажай, С.Р. Рачэўскі. – Мінск, 1990.
18. Методика реподавания русского языка в школе : учебник для студ. высш. пед. учеб. заведений / М.Т. Баранов [и др.] ; под ред. М.Т. Баранова. – М. : Академия, 2000. – 358 с.
19. **Мурина, Л.А.** Методика русского языка в школах Белоруссии : учеб. пособие / Л.А. Мурина. – Минск : Университетское, 1990. – 320 с.
20. **Протчанка, В.У.** Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. – Мінск, 2001.
21. **Протчанка, В.У.** Вывучэнне сінтаксісу ў школе Словазлучэнне. Просты сказ. – Мінск, 1981.
22. **Протчанка, В.У.** Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Складаны сказ. – Мінск, 1984.
23. Теория и пракика обучения русскому языку : учеб. пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений / Е.В. Архипова, Т.М. Воителева, А.Д. Дейкина [и др.] ; под ред. Р.Б. Саботкоева. – М. : Издательский центр “Академия”, 2005. – 320 с..
24. **Яленскі, М.Г.** Развіццё вуснай мовы вучняў: 4–6 класы. – Мінск, 1985.
25. Адукацыйны стандарт. Агульная сярэдняя адукацыя. Беларуская мова // Общее среднее образование. Социально-гуманитарные дисциплины. – Минск, 1999.
26. Інструкцыя аб парадку фарміравання вуснай і пісьмовай мовы ў гульнаадукацыйных установах // Настаўніцкая газета. – Кастрычнік. – 2008.
27. Канцэпцыя прадмета “Беларуская мова”.
28. Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па беларускай мове // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – № 4.
29. Праграмы і падручнікі па беларускай мове для агульнадукацыйнай сярэдняй школы.
30. Настаўніцкая газета.
31. Роднае слова.
32. Беларуская мова і літаратура.
33. Русский язык в школе.
34. Русская словесность.
35. Інтэрнэт-рэсурсы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА....3
1. Мэты, змест і структура моўнай адукацыі....4
2. Прадмет, задачы, фундаментальныя паняцці і навуковыя асновы методыкі выкладання беларускай мовы....6
3. Прынцыпы навучання....8
4. Метады і прыёмы навучання беларускай мове....10
5. Урок беларускай мовы....12
6. Методыка выкладання арфаграфіі....13
7. Методыка навучання пунктуацыі....15
8. Методыка лексікі і фразеалогіі....16
9. Методыка выкладання фанетыкі....20
10. Методыка вывучэння словаўтварэння....21
11. Методыка выкладання марфалогіі....23
12. Методыка развіцця звязнага маўлення....28
14. Методыка выкладання сінтаксісу....31
14. Методыка пазакласнай працы па беларускай мове....33
15. Арфаграфічны рэжым....34

*Дадатак 1.* Паказчыкі эфектыўнасці ўрока і сістэмы ўрокаў, прынцыпы аналізу ўрока....36
*Дадатак 2.* Прыкладная схема аналізу ўрока беларускай мовы....38
*Дадатак 3.* Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь....40
*Дадатак 4.* Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»....44

АДКАЗЫ....46

РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА....48

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ДЛЯ ЗАЎВАГ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

**Казімірская** Таццяна Анатольеўна

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

## Тэставыя заданні

Тэхнічны рэдактар *А. Л. Пазнякоў*
Камп'ютарная вёрстка *А. Л. Пазнякоў*

Падпісана да друку 13.12.2018 г.
Фармат 60x84/$_{16}$. Гарнітура TimesNewRoman.
Ум.-друк. арк. 3,0. Ул.-выд. арк. 2,0. Тыраж 69 экз. Заказ № .

Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»,
212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы і распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/131 ад 03.01.2014 г.

Надрукавана ў аддзеле аператыўнай паліграфіі
МДУ імя А. А. Куляшова. 212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова